# АСАБЛІВАСЦІ АЙКОНІМАЎ МАЗЫРШЧЫНЫ

***Мальчукова І.У.*** *(УО МГПУ им. И.П. Шамякина, г. Мозырь)*
***Навуковы кіраўнік –*** *В.В. Шур, д-р філал. навук, прафесар*

Спецыяльных лінгвістычных даследаванняў, прысвечаных апісанню і сістэматызацыі айканіміі Мазыршчыны, яшчэ няма. Аднак асобныя звесткі пра айконімы гэтага рэгіёна можна выявіць ў кнігах, слоўніках В. Жучкевіча, В. Лемцюговай, А. Рогалева, Н. Багамольнікавай, А. Станкевіч, А. Бабра, У. Лякіна і інш. Энцыклапедычную інфармацыю пра Мазыршчыну ўтрымліваюць: "*Беларуская энцыклапедыя*" у 18 тамах, трохтомнік "*Мазыр 850 год*", энцыклапедычнае выданне "*Гарады і вёскі Беларусі: Энцыклапедыя*, Т. 2, кн. 2: *Гомельская вобласць*", гісторыка-дакументальная хроніка "*Памяць. Мазыр, Мазырскі раён*" і інш.

Тапанімія Мазыршчыны – істотная частка ўсёй беларускай тапанімічнай сістэмы. Усяго афіцыйных адзінак у рэгіёне 92, а ў мінулыя часы іх было значна больш. Па розных прычынах зніклі тыпы пасяленняў, гэта былыя хутары (*Козенкі, Сузькі, Кунгеры*), мястэчкі (*Скрыгалаў, Барбароў*), слабоды (*Слабада Скрыгалаўская*), некаторыя паселішчы перажылі лёс Хатыні і не адноўлены, архаізаваліся іх назвы (*Спрымачоў, Чарамашня*). Толькі ў ваколіцах Мазыра, як сведчаць афіцыйныя звесткі, было ў канцы 20-х гадоў XX ст. каля чатырохсот хутароў, многія з іх мелі назвы, утвораныя спосабам трансанімізацыі – ад прозвішчаў іх заснавальнікаў: хутар *Сузькі* – ад прозвішча *Сузько*, хутар *Кунгеры* – ад прозвішча *Кунгер*, вёскі *Бабры*, *Бабраняты* – ад частага на Мазыршчыне прозвішча *Бобр* і інш. Гэтым спосабам, гэта значыць, ад асабовых уласных імёнаў, мянушак, прозвішчаў першых пасяленцаў, заснавальнікаў паселішчаў на Мазыршчыне ў розныя часы ўтворана 22 айконімы: *Акулінка, Барбароў, Казіміраўка, Касцюковічы, Майсееўка, Матрункі,* што складае 22% ад усіх засведчаных у рэгіёне.

Спосабы ўтварэння тапонімаў, іх граматычныя асаблівасці розныя: 8 назваў маюць форму прыметнікаў: *Горная, Перадавы, Крынічны, Майская, Раеўскія, Нагорная, Белая, Сасновы*; 14 – форму "прыметнік + назоўнік" (*Ніжні Млынок, Верхні Млынок, Чырвоная Горка, Новая Ніва, Зялёны Мох, Малы Бокаў, Вялікі Бокаў, Гіневічаў Груд, Крынічная Града, Вялікія Зімовішчы, Малыя Зімовішчы, Казіміраўская Буда, Глініцкі Пасёлак, Заводны Востраў*). Акрамя тапонімаў названых тыпаў, ёсць такія, якія ўжываюцца толькі ў форме множнага ліку. Іх 30: *Бібікі, Пянькі, Матрункі, Мялешкавічы, Бабры, Козенкі, Дразды, Балажэвічы, Булаўкі, Бабраняты, Падлядзічы, Лучажэвічы, Жахавічы, Пранькі, Навікі, Міхалкі, Міцькі* і інш.; частка айконімаў – уласныя назвы з чыстай асновай: *Мазыр, Камень, Прагрэс* і інш.

МГПУ им. И.П. Шамякина